Людміла СІЛЬНОВА

## ШЧАСЦЕ МАЦЯРЫНСТВА

*На станцыю, дзе шчасце*
*мацярынства,*
*Ужо прывёў мяне жаночы лёс.*
*Зялёныя вагончыкі дзяцінства*
*За далягляд адвозіць паравоз.*

*...У цёплай коўдры — камячок*
*ружовы.*
*Пупышка і крынічка ты мая!*
*З табою пачынаецца нанова*
*Мая вандроўка, ці — ужо твая...*

## ПРОСЬБА

*Адпусці мяне ў воды празрыстыя,*
*Малады шэравокі рыбак,*
*Дзе стракозы, дзе вольхі вячыстыя,*
*Дзе чакае мяне мой шчупак!*

*Ён пад голлем старога алешніку*
*Скаламуціць ваду у журбе...*
*Адпусці мяне ў воды нягрэшныя,*
*Я не стану сяброўкай табе.*

*Замалая, нямая, халодная,*
*Ну, нашто я табе — акрамя*
*Як вячэра ў часіну галодную?*
*І забудзеш маё ты імя...*

*Вось і вочы табе я запырскала.*
*Ці то слёзы? Не ўцямлю ніяк.*
*Адпусці мяне ў воды празрыстыя,*
*Малады, спалатнелы рыбак!*